

РАЗВІТАННЕ З ПЕСТЫЦЫДАМІ 2

БЮДЖЭТ ПРАЖЫТАЧНАГА МІНІМУМУ ВЫРАСЦЕ 3



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

28 КРАСАВІКА 2023 г. ПЯТНІЦА № 80 (29960)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Алег АНДРЭЙЧЫК, намеснік міністра спорту і турызму:**

*«У 2023 годзе ў краіне з'явілася 211 новых турыстычных маршрутаў. Сярод іх шмат камбінаваных маршрутаў па балотах, экалагічных сцежках, кар'ерах і іншых месцах. Таксама развіваюцца сплавы на байдарках і веласіпедны турызм. Прапаноў шмат, таму кожны турыст зможа знайсці сабе дастойны і якасны адпачынак».*

# ЭНЕРГІЯ МІРУ



Кожны год у Хойніках у канцы красавіка збіраюцца энергетыкі з усёй краіны, каб ушанаваць памяць сваіх калег, супрацоўнікаў Чарнобыльскай АЭС, якія бралі ўдзел у ліквідацыі аварыі. Сёлета таксама палескі горад прымаў энергетыкаў і ветэранаў з усёй Беларусі — амаль дзвесце чалавек — і прадстаўнікоў з Расіі. Яны заклалі «Алею пакаленняў», усклалі кветкі да скульптурнай кампазіцыі энергетыкам-ліквідатарам Савецкага Саюза. А маладыя энергетыкі выпусцілі ў неба галубоў. Сярод іх быў і Андрэй ОСІНЦАЎ, начальнік хойніцкага ўчастка філіяла энергазбыту «Гомельэнерга».

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

КОРАТКА

• Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка праінспектаваў палі ў Віцебскай і Магілёўскай абласцях. «Інспекцыя без гальштукаў, дакладаў і справаздач, — піша тэлеграм-канал «Пул Першага». — Лукашэнка — на Радзіме, дзе і праінспектаваў пасевы аўса і гароху на палях Віцебскай вобласці, а таксама прэзідэнцкае эксперыментальнае поле ў Магілёўскай вобласці (у мінулым сезоне ў Александрыі селілі ячмень)».

• **Беларусь і Новасібірская вобласць падпішуць кантракты больш як на $13 млн.**

• Сярэдняя зарплата ў Беларусі ў сакавіку склала Br1814,2.

• **Адпраўка прызыўнікоў на тэрміновую ваенную службу пачалася ў Беларусі.**

• Шагойка: вытворчасць мяснай прадукцыі павялічылася на 10 працэнтаў.

• **Мацвей Дукса прызнаны найлепшым гульцом 5-га тура футбольнага чэмпіянату Беларусі.**

• Экспарт турпаслуг у Беларусі за 2022 год склаў $180 млн.

ISSN 1990 — 763X

Прыёмная кампанія — 2023

## АБ'ЁМЫ ПАДРЫХТОЎКІ Ў РЭГІЯНАЛЬНЫХ ВНУ БУДУЦЬ РАСЦІ

### Пра якія яшчэ важныя акалічнасці трэба ведаць абітурыентам бягучага года



**Ва ўстановы вышэйшай адукацыі плануецца прыняць сёлета 52,2 тысячы чалавек. З іх за кошт сродкаў бюджэту будуць навучацца 28,4 тысячы першакурснікаў і 23,8 тысячы — на платнай форме навучання. Як расказаў журналістам першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр БАХАНОВІЧ, у параўнанні з папярэднім годам агульная лічба набору скарацілася на 900 чалавек. Пры гэтым на бюджэтную форму навучання набяруць на 600 чалавек больш, чым летась, а на платныя месцы набор, наадварот, скароціцца на 1,5 тысячы абітурыентаў.** СТАР. 4

Добры прыклад

## З БАНКРУТА — У ЛІДАРЫ

### Як моцная гаспадарка ўзняла эканоміку адсталага сельгаспрадпрыемства

**Некалькі гадоў таму саўгас «Поразава», што ў Свіслацкім раёне, аказаўся перад фактам ліквідацыі. У гаспадаркі была высокая запазычанасць перад фондам сацыяльнай абароны. Каб разлічыцца, трэба было прадаваць альбо статак, альбо ўраджай. Зразумела, што такі вынік вёў проста ў тупік. Таму раённымі ўладамі было прынята рашэнне аб продажы маёмасці і вытворчай базы саўгаса. Актывамі зацікавіўся старшыня СВК імя Дзеншчыкова Гродзенскага раёна Васіль СВІРЫД. Пасля ўсіх неабходных працэдур у поразаўскай гаспадарцы пачалася татальная перабудова.**

СТАР. 3



Блізкая ўлада

# «ЗРОБІМ УСЁ, ШТО АД НАС ЗАЛЕЖЫЦЬ»

## Наталля КАЧАНАВА правяла асабісты прыём грамадзян

**У Савет Рэспублікі звярнуліся жыхары многіх рэгіёнаў краіны. Традыцыйна грамадзян хваляваў самы шырокі спектр пытанняў, звязаных з сацыяльнай адаптацыяй дзяцей-інвалідаў, жыллёва-камунальнай гаспадаркай, землекарыстаннем, падаткаабкладаннем, будаўніцтвам, паляпшэннем жыллёвых умоў. Прасілі і аб дапамозе ў працаўладкаванні, цікавіліся магчымасцю вярнуць статус малалетняга вязня, скардзіліся на шум машын за акном і ўздымалі пытанне выхавання моладзі ў духу традыцыйных маральных каштоўнасцяў.**

Больш падрабязна мы раскажам аб гэтым на старонках «Мясцовага самакіравання», выпуск якога запланаваны на 3 мая. У гэтым жа нумары спынімся на звароце, які ўсё ж быў непадобны на ўсе іншыя.

Прыехаць на прыём з Добруша Наталлю Краўцову прымусіла хвароба яе маленькай дачкі. Дзяўчынцы нядаўна споўнілася два гады, і яна мае патрэбу ў вельмі дарагім лячэнні. Маленькая Віка — адна з тых нямногіх дзяцей у нашай краіне, у якіх дыягнаставана спінальная мышачная атрафія другога тыпу. Каб спыніць развіццё захворвання, дзяўчынцы патрэбна адна ін'екцыя прэпарату замежнай вытворчасці. У сям'і няма такіх грошай, каб набыць адзін з самых дарагіх прэпаратаў у свеце.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Некаторыя пытанні Наталля КАЧАНАВА аператыўна ўдакладняла па тэлефоне прама падчас прыёму.**

З просьбай аб дапамозе мама дзяўчынкі звярнулася ў Савет Рэспублікі.

Наталля Качанава ўважліва выслухала жанчыну і сказала, што ў курсе гэтага пытання і ўвогуле такой праблемы, як спінальна-мышачная атрафія. Спікер верхняй палаты парламента пацікавілася ў намесніка міністра аховы здароўя, які прысутнічаў на прыёме, колькі такіх дзяцей у краіне маюць патрэбу ў дапамозе і колькі грошай каштуе адна такая ін'екцыя. Сума — немалая. Аднак калі кожны, па словах Старшыні Савета Рэспублікі, ахвяруе хоць бы некалькімі рублямі, то з'явіцца магчымасць дапамагчы гэтым дзецям.

У прыватнасці, неабыякавыя да чужой бяды грамадзяне могуць пералічыць сродкі на дабрачынны рахунак, адкрыты Беларускім саюзам жанчын. Збор сродкаў для набыцця лекаў для дзяцей з жыццёвапагражальнымі захворваннямі, у тым ліку СМА, ажыццяўляецца па наступных рэквізітах: УНП 100094859, дабрачынны рахунак — BY05 AKBB 3135 0000 1234 5000 0000 у ААТ «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X. Дабрачынны рахунак у «Беларусбанку» адкрыты і на імя маці дзяўчынкі Наталлі Віктараўны Краўцовай.

Як расказаў **намеснік міністра аховы здароўя Юрый ГОРБІЧ,** у цяперашні момант у Беларусі двое дзяцей да двух гадоў, якія трапляюць пад крытэрыі прэпарату, што адносіцца да геннай тэрапіі. Вікторыя — трэцяе дзіця, якому яшчэ можна дапамагчы. Нягледзячы на тое што дзяўчынцы ўжо споўнілася два гады (эфектыўнасць прэпарату даказана для прымянення ў дзяцей да двух гадоў), яна важыць да 13 кілаграмаў, што таксама абумоўлена яго ўвядзеннем. Іншым дзецям з такім дыягназам (іх у Беларусі каля ста) аказваецца падтрымлівальная тэрапія. Як расказаў Юрый Горбіч, пакуль гэта ажыццяўляецца за кошт спонсарскіх сродкаў. Аднак Міністэрствам аховы здароўя прапрацоўваецца механізм дапамогі, якая будзе аказвацца за бюджэтныя сродкі.

Старшыня Савета Рэспублікі падрабязна распытала заяўніцу аб тым, як у дзяўчынкі пачалося захворванне, у якім стане яна знаходзіцца ў цяперашні час. Таксама пацікавілася, ці ёсць у жанчыны яшчэ дзеці і ці здаровыя яны. Наталля Краўцова расказала, што яна шматдзетная маці. Двое старэйшых дзяцей, на шчасце, праблем са здароўем не маюць. Калі нарадзілася малодшая, Вікторыя, нічога не прадвяшчала бяды. Аб страшным дыягназе бацькі даведаліся, калі дзяўчынка спрабавала зрабіць свае першыя крокі.

Наталля Качанава паабяцала, што будзе зроблена ўсё магчымае, каб закупіць лекі для дзяўчынкі і іншых дзетак, хворых на СМА. «Зробім усё, што ад нас залежыць», — запэўніла яна заяўніцу і адразу падчас прыёму дала шэраг даручэнняў Міністэрству антыманапольнага рэгулявання і гандлю, а падчас невялікага перапынку зрабіла рад званкоў дырэктарам буйных прадпрыемстваў з просьбай ахвяраваць некаторую суму на лячэнне хворага дзіцяці.

Пасля прыёму ў Савеце Рэспублікі Наталля Краўцова падзялілася, што верыць у тое, што атрымаецца сабраць патрэбную суму і яе дачка абавязкова будзе жыць. «Я сыходжу з самымі прыемнымі ўражаннямі, — адзначыла жанчына. — Наталля Іванаўна вельмі ўважліва і добразычліва мяне выслухала, сама абстаноўка спрыяла размове. Спадзяюся, што ўсё будзе добра».

**Вераніка КАНЮТА.**

Экабяспека

# Цяпер — без пестыцыдаў

## 3 тэрыторыі Віцебскай вобласці вывезлі апошнюю партыю непрыдатных шкодных рэчываў

**Праект Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя пры садзейнічанні Праграмы развіцця ААН рэалізоўваецца ў нашай краіне са студзеня 2020 года. У межах праекта небяспечныя адходы вывозяць у Германію для экалагічна бяспечнага знішчэння на спецыялізаваных прадпрыемствах. Перад адпраўкай адходы 1-2 класаў небяспекі пераўпакоўваюцца, узважваюцца і з захаваннем бяспечнай трансгранічнай перавозкі накіроўваюцца на нямецкія спецыялізаваныя прадпрыемствы. Так, да пачатку рэалізацыі мерапрыемстваў агульная вага непрыдатных пестыцыдаў на складах сельскагаспадарчых арганізацый Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей складала больш за 1,4 тысячы тон. Донарам праекта з'яўляецца Глабальны экалагічны фонд, агульны аб'ём фінансавання склаў 8,4 мільёна долараў.**

На сёння на тэрыторыях Віцебскай і Гродзенскай абласцей ліквідаваны 21 склад з непрыдатнымі пестыцыдамі, вывезена больш за 900 тон адходаў. Апошнюю партыю з пестыцыдамі адправілі 26 красавіка з Полацкага раёна. На чарзе — Міншчына, дзе знаходзіцца 12 складоў. Мінпрыроды плануе канчаткова завяршыць работы па ачышчэнні ў першым квартале 2024 года.

Праектам таксама прадугледжваецца вываз з тэрыторыі Беларусі адходаў, якія змяшчаюць поліхлараваныя біфенілы. Яны належаць да стойкіх арганічных забруджвальнікаў і прызнаны найбольш небяспечнымі для навакольнага асяроддзя і здароўя чалавека. На сёння вывезена ўжо 260 тон такіх адходаў, усяго ў межах праекта плануюць ліквідаваць больш за 1000 тон з 300 беларускіх прадпрыемстваў.

Непрыдатныя пестыцыды — гэта адходы ад работы сельгаспрадпрыемстваў, якія маюць першы клас небяспекі і з'яўляюцца вельмі шкоднымі для іх захоўвання на складах. Каля 500 тон такіх рэчываў — фактычна адпрацаваных ядахімікатаў — знаходзіцца на паверхневых складах у Мінскай вобласці і каля 5000 тон — на Гомельшчыне, а яшчэ ёсць пяць падземных сховішчаў пестыцыдаў прыкладна на чатыры тысячы тон. Мяркуецца, што да канца гэтага года ў Чачэрскім раёне з'явіцца спецыялізаваны завод па спальванні пестыцыдаў, а пазбавіцца ад усіх небяспечных адходаў Беларусь зможа ў першым квартале 2024-га. Аднак найбольш небяспечныя адходы будуць працягваць вывозіць на знішчэнне на заводах у Францыі і Германіі ў межах праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Устойлівае кіраванне стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі і хімічнымі рэчывамі ў Рэспубліцы Беларусь, ГЭФ-6».

Чакаецца, што ўсе непрыдатныя пестыцыды са складоў у Беларусі будуць вывезены за мяжу да моманту завяршэння праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі, паведаміў **Аляксандр КОРБУТ, намеснік міністра прыродных рэсурсаў:**

— Пестыцыды засталіся беларусам у спадчыну ад савецкага часу (70—80-х гадоў), і за такі доўгі час захоўвання існуе небяспека, што яны могуць наносіць пэўную шкоду наваколлю. Таму ў межах праекта захаванні найперш даследаваліся. Пакуль негатыўных тэндэнцый уплыву на асяроддзе няма. Аднак мы мяркуем падрыхтаваць новы праект, каб можна было дастаць пестыцыды, перапакаваць іх і захоўваць на прадпрыемстве «Чачэрскі» або вывезці на знішчэнне.

На прадпрыемствы ў Францыю і Германію адпраўляюцца найбольш небяспечныя, у прыватнасці ртуцьзмяшчальныя пестыцыды, якія патрабуюць найбольш складаных і тэхналагічных умоў знішчэння. Справу па вывазе можна было б скончыць і раней, аднак яе стрымлівае сітуацыя на мяжы на выезд у Еўрапейскі саюз, удакладніў спецыяліст Мінпрыроды.

На прадпрыемстве, якое да канца года павінна з'явіцца ў Чачэрскім раёне, сіламі беларусаў будуць знішчацца непрыдатныя пестыцыды, якія не ўтрымліваюць ртуць. Зараз спецыялісты абследавалі ўжо каля тысячы бочак, і іх хімічны склад дазваляе быць упэўненым у тым, што яны будуць знішчацца экалагічна бяспечна. А склады, якія ўжо ачышчаны і прыдатны для далейшага выкарыстання, пасля дэзінфекцыі могуць выкарыстоўвацца з іншай мэтай.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**Ірына СІДАРОК.**

PARITETBANK
ТВОЙ И ЦИФРОВОЙ

ИНФОРМАЦИЯ
об открытом акционерном обществе «Паритетбанк» и его деятельности по состоянию на 01.01.2023

*(место нахождения общества: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а)*

**Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 2440 | 2448 |
| в том числе юридических лиц | лиц | 58 | 59 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 1 | 1 |
| в том числе физических лиц | лиц | 2382 | 2389 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 15 | 14 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,90 | 0,90 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,90 | 0,90 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) | рублей | 0,000048 | 0,000048 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) | рублей | 0,000048 | 0,000048 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | за 2021 год | X |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 29.03.2022 | X |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | с 29.04.2022 | X |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | 79118482 | 78861541 |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 606 | 560 |

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 20 и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): деятельность коммерческих банков.

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2022 год: 28.03.2023.

Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности подготовлено 20.03.2023.

Аудит проведен (наименование аудиторской организации (фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется) индивидуального предпринимателя), местонахождение (место жительства), дата государственной регистрации, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей): Общество с ограниченной ответственностью «Кэпт», Республика Беларусь, 220012, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Платонова, д. 49, пом. 26-7, зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 10.02.2011, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 191434140, регистрационный номер записи аудиторской организации в реестре аудиторских организаций № 10038.

Период, за который проводился аудит: 2022 год.

Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности – сведения о данных нарушениях: годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Паритетбанк» отражает достоверно во всех существенных аспектах финансовое положение ОАО «Паритетбанк» на 31.12.2022, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2022 год, в соответствии с законодательством и нормативными правовыми актами Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и составления годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности банками.

Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме: 20.04.2023 на сайте ОАО «Паритетбанк», 15.04.2023 в газете «Звязда».

Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета): разработаны и утверждены: Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг, Положение о Наблюдательном совете, Положение о Ревизионной комиссии, Положение по организации работы с инсайдерами, аффилированными лицами и связанными сторонами в ОАО «Паритетбанк», Положение о комитете по рискам, Положение об аудиторском комитете, Положение о комитете по кадрам и вознаграждениям.

Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет: www.paritetbank.by.

Телефон для справок +375 (17) 3114353.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 01 апреля 2021 года № 5. УНП 100233809

# З БАНКРУТА — У ЛІДАРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як паясніў **першы намеснік старшыні Свіслацкага райвыканкама Андрэй ГРЫЦКЕВІЧ**, у адносінах саўгаса стаяла пытанне альбо выплачваць даўгі з растэрміноўкай, альбо наогул ліквідаваць. У раёне зрабілі выбар у бок ліквідацыі. «Мы свядома пайшлі на гэта, — удакладняе Андрэй Грыцкевіч. — З часткі прадпрыемства быў створаны вытворча-маёмасны комплекс, а тая частка, якая не мела такога актыву, была выстаўлена на аўкцыён. На сённяшні дзень усе аб'екты прыдбаны і рацыянальна выкарыстоўваюцца».

Такім чынам, вытворча-маёмасны комплекс «Поразава» ў складзе машынна-трактарнага парку, сушыльнага комплексу, 500 галоў буйной рагатай жывёлы праз аўкцыён перайшоў да СВК імя Дзеншчыкова Гродзенскага раёна.

Старшыня Васіль Свірыд успамінае, што спачатку прыехаў паглядзець стан поразаўскага саўгаса. Пагутарыў з кіраўніцтвам раёна. Прыгадаў і размову ў наглядальным савеце ААТ «Малочны свет», у склад якога ўваходзіць і ён сам. Падчас чарговага пасяджэння пачуў ад членаў савета такую рэпліку: «Трэба выпраўляць становішча былога саўгаса. Чаму б адной з найлепшых малочных гаспадарак краіны не паказаць прыклад у дапамозе банкрутам?»

Трэба сказаць, што СВК імя Дзеншчыкова славіцца высокімі надоямі. Гаспадарка займае першае месца па надоях малака ў Гродзенскай вобласці і другое ў краіне. Летась у сярэднім ад каровы тут атрымалі 12,3 тысячы кілаграмаў малака. Рэнтабельнасць складае амаль 100 %. Такія паказчыкі склаліся дзякуючы высокапародзістаму статку і вялікай селекцыйнай рабоце спецыялістаў.



Старшыня СВК імя Дзеншчыкова Васіль СВІРЫД (*злева*).

Далучаны філіял прыйшлося ўзнімаць амаль з нуля.

Васіль Свірыд са сваёй камандай узяўся за новы ўчастак работы, можна сказаць, з імпэтам. А вось месцічы пазіралі на іх з недаверам. Ды і многія работнікі былога саўгаса аднесліся да новага гаспадара скептычна. Мала хто верыў у поспех, прычым настрою свайго не хавалі. Старшыня ж імкнуўся даказаць, што выйсці на добры ўзровень можна, нават пачынаючы з адсталага прадпрыемства. Так і здарылася.

— Кадры засталіся тыя, што і працавалі, а хто не хацеў працаваць, сышлі. Асабліва тыя, хто сумняваўся і якім падалося, што вельмі жорсткія ўмовы. Але пры такім раскладзе інакш і быць не магло. Між тым астатнія вытрымалі, усе яны тутэйшыя, добра працуюць. У цэлым калектыў, які працаваў у саўгасе «Поразава», захаваўся, — заўважыў Васіль Свірыд. — Людзі вераць у поспех, бо яны бачаць, як змяніліся ўмовы працы, а рашэнні прымаюцца на карысць работнікаў. Мяркую, што ўжо сёлета яны могуць выйсці на ўзровень зарплаты вышэйшы, чым у галаўным сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве імя Дзеншчыкова.

**Загадчыца фермы Ядвіга ДЗЕМЯНЧЫК** з гонарам праводзіць экскурсію па адноўленым аб'екце.

— У адсталай гаспадаркі з'явіўся новы гаспадар — і вось вынік. Цяпер тут многае змянілася ў лепшы бок. Прычым калектыў той жа. Даяркі атрымліваюць да 1,5 тысячы рублёў. І графік даволі зручны. Цяпер і тыя, хто звольніўся, просяцца назад — бяром, вядома. І ўмовы ў нас добрыя, такімі і павінны быць фермы.

Зразумела, без дасягнення пэўных эканамічных паказчыкаў такі сацыяльны складнік наўрад ці быў бы магчымы. Таму ў першую чаргу на былой поразаўскай ферме распачалі тэхналагічную перабудову. Найперш заняліся кармамі. Для іх вырошчвання было адведзена паўтары тысячы гектараў зямлі. Але кіслотнасць не адпавядала кармавым раслінам, у прыватнасці, люцэрне. Таму было закуплена 630 тон даламіту. У Поразаве ўкаранілі такую ж схему, як і ў СВК імя Дзеншчыкова — працавалі вахтавым метадам. Дзякуючы згаданаму падыходу на новай зямлі атрымалі добры ўраджай кармавых культур.

— Вось гэтыя пяць траншэй за ўвесь папярэдні час работы малочнатаварнага комплексу ні разу не былі запоўненыя, а цяпер яны не толькі запоўненыя — нават месца не хапіла, каб увесь ураджай размясціць, трэба яшчэ адну такую рабіць, — ківае ў бок уладкаваных кармавых сховішчаў Васіль Апанасавіч. — Бо калі хочам атрымліваць прадукцыю, трэба, каб былі якасныя кармы і ў дастатковым аб'ёме. Без гэтага станоўчых вынікаў у жывёлагадоўлі не будзе.

Ну і ў ферму прыйшлося ўкласціся. Каб палепшыць умовы, тут цэлы год працавала будаўнічая брыгада. Нарэшце з'явілася гарачая вада, палепшыўся быт. Вытворчая база таксама змянілася. Устанавілі новае даільнае абсталяванне коштам больш за 180 тысяч рублёў. Замянілі халадзільную ўстаноўку. Давялося затраціць на аднаўленне комплексу сем мільёнаў рублёў. Гэта дазволіла прывезці сюды паўтысячы пародзістых цялушак. Цяпер адсталая некалі гаспадарка займае другое месца па малаку ў Свіслацкім раёне.

— За мінулы год мы прадалі каля сямі тысяч тон малака, рэнтабельнасць склала 71 працэнт. Атрымалі 2,5 мільёна рублёў прыбытку. У раслінаводстве таксама спрацавалі з прыбыткам у 350 тысяч рублёў. Такім чынам, агульная рэнтабельнасць у былога банкрута за кароткі час склала 54 працэнты, — паведаміў старшыня.

Каб зразумець, як атрымаўся такі хуткі станоўчы вынік у няпростай сельскагаспадарчай справе, трэба ведаць асобу старшыні прадпрыемства. Васіль Свірыд — адзін з самых вопытных кіраўнікоў на Гродзеншчыне, на чале СВК імя Дзеншчыкова ён больш за 40 гадоў. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі. А галоўнае — наватар у сферы АПК. Сочыць за ўсімі інавацыямі і не баіцца рызыкаваць. У гаспадарцы ў ліку першых у рэгіёне ўкаранілі элементы паралельнага ваджэння, якія дазваляюць кіраваць трактарам без механізатара. Цяпер вядзецца работа над стварэннем электроннай кнігі гісторыі палёў. У перспектыве на кожным трактары будзе ўстаноўлена праграма, якая вызначыць усе неабходныя параметры работы на палі. Дзякуючы ўласнаму цэху перапрацоўкі рапсу тут атрымліваюць штогод каля трох тысяч тон алею. А яшчэ СВК імя Дзеншчыкова — адзіная ў Гродзенскім раёне гаспадарка, дзе вырошчваюць зялёны гарошак. Пра «малочныя рэкі» сельгаспрадпрыемства ўжо было згадана вышэй. Гэта лідар малочнай жывёлагадоўлі рэгіёна.

Якія найбліжэйшыя планы? У філіяле «Поразава» збіраюцца пабудаваць склад мінеральных угнаенняў. А ўвогуле Васіль Апанасавіч лічыць самым важным утрымацць тое, што створана. На яго думку, сёння ёсць усё, каб нармальна працаваць, у тым ліку і ў філіяле «Поразава», які зусім нядаўна лічыўся амаль што банкрутам.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

---

Добрая навіна

# З 1 МАЯ ЎЗРАСЦЕ БЮДЖЭТ ПРАЖЫТАЧНАГА МІНІМУМУ

**Ён складзе 352 рублі 13 капеек. Адпаведна павялічацца дзяржаўныя дапамогі на дзяцей, сацыяльныя пенсіі і павышэнні да пенсій для асобных катэгорый грамадзян, даплаты пенсіянерам ва ўзросце 75 гадоў і старэйшым, дапамогі па доглядзе інвалідаў I групы і пажылых людзей, якія дасягнулі 80 гадоў.**

Як паведамляе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, памеры бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах зацверджаны адпаведнай пастановай на перыяд з 1 мая да 31 ліпеня 2023 года.

Такім чынам, бюджэт пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ўстаноўлены ў памеры 352 рублі 13 капеек, што на 3,1 % вышэй, чым той, што дзейнічаў з 1 лютага да 30 красавіка 2023 года.

Памеры бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах наступныя: 389 рублёў 53 капейкі — для працаздольнага насельніцтва, 265 рублёў 96 капеек — для пенсіянераў, 224 рублі 26 капеек — для дзяцей да трох гадоў, 308 рублёў 56 капеек — для дзяцей ад 3 да 6 гадоў, 378 рублёў 15 капеек — для дзяцей ад 6 да 18 гадоў.

У сувязі са змяненнем БПМ з 1 мая аўтаматычна пералічваюцца ўбудаваныя ў сістэму сацыяльнай абароны розныя надбаўкі і павышэнні, а таксама асобныя сацыяльныя выплаты, якія вылічваюцца ад памеру БПМ. Гэта памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей; павышэнні да пенсій, якія прадугледжаны для асобных катэгорый пенсіянераў; даплаты і надбаўкі пенсіянерам ва ўзросце 75 гадоў і старэйшым, якія атрымліваюць пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне; дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, сацыяльныя пенсіі.

### ДАПАМОГІ НА ДЗЯЦЕЙ ТАКСАМА ПАВЯЛІЧАЦЦА

Дзяржаўныя дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, устанаўліваюцца ў наступных памерах. Дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці (аднаразовая) пры нараджэнні першага дзіцяці складзе 10 БПМ, ці 3 521,30 рубля, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 14 БПМ, ці 4 929,82 руб. Дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці (аднаразовая) складзе 100 % БПМ, ці 352,13 рубля.

Дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў (штомесячная) роўная 50 % БПМ, ці 176,07 рубля. Дапамога на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў, прадугледжаных заканадаўствам (штомесячная) на дзяцей, старэйшых за 3 гады, якія выхоўваюцца ў такіх сем'ях (акрамя дзіцяці-інваліда) роўная 50 % БПМ, або 176,07 рубля, на дзіця-інваліда, старэйшага за 3 гады, — 70 % БПМ, або 246,49 рубля.

Дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў (штомесячная) з I і II ступенню страты здароўя да спаўнення дзіцяці 18 гадоў і з III і IV ступенню страты здароўя да спаўнення дзіцяці ўзросту 3 гадоў выплачваецца ў памеры 100 % БПМ і складзе 352,13 рубля, з III і IV ступенню страты здароўя пасля спаўнення дзіцяці ўзросту 3 гадоў — 120 % БПМ, або 422,56 рубля, дапамога на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека (штомесячная), — 70 % БПМ, ці 246,49 рубля.

**Алена КРАВЕЦ.**

---

Надвор'е

# Канец красавіка «парадуе» замаразкамі

**Не паспелі батарэі «замерзнуць», а тут і пахаладала. Праўда, ненадоўга і не ўсюды. У апошнія дні красавіка ноччу месцамі нават будзе падмарожваць да мінус 3 градусаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

І ў пятніцу ўмовы надвор'я будзе вызначаць прахалодная няўстойлівая паветраная маса. Чакаецца пераменная воблачнасць. Уначы пераважна без ападкаў, днём месцамі па краіне пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Вецер паўночна-заходні, заходні ўмераны, удзень месцамі парывісты. Мінімальная тэмпература паветра ўначы ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла, па ўсходзе краіны да плюс 5 градусаў. Максімальная тэмпература ўдзень складзе 9—15 цяпла. Атмасферны ціск ноччу будзе слаба расці, днём істотна не зменіцца.

А вось у суботу адаб'ецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску, сфарміраванай у прахалоднай паветранай масе. Чакаецца воблачна з праясненнямі, пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі па Брэсцкай вобласці чакаюцца невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах будзе згушчацца слабы туман. Вецер пераменных кірункаў слабы да ўмеранага. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе ад 2 градусаў марозу да плюс 5, максімальная тэмпература днём будзе знаходзіцца ў межах 10—16 цяпла.

У апошні дзень красавіка адаб'ецца ўплыў франтальнага раздзелу, які ссоўваецца з тэрыторыі Польшчы. Будзе воблачна з праясненнямі. Ноччу месцамі па краіне, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Вецер паўднёвы з пераходам на заходні ўмераны. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе ўжо 1—6 цяпла, у паўднёва-заходніх раёнах Беларусі да плюс 9 градусаў. Максімальная тэмпература днём складзе ад плюс 10 градусаў па паўночным захадзе да 18 цяпла па паўднёвым усходзе краіны.

### А ў лес лепш пакуль не хадзіць

Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў уведзены ў 19 раёнах Беларусі. Забароны дзейнічаюць на тэрыторыі 11 раёнаў Магілёўскай вобласці — Шклоўскага, Магілёўскага, Чавускага, Мсціслаўскага, Слаўгарадскага, Чэрыкаўскага, Крычаўскага, Клімавіцкага, Краснапольскага, Касцюковіцкага і Хоцімскага. Абмежаванні на наведванне лесу ўведзены ў Лоеўскім раёне Гомельскай вобласці, Драгічынскім, Ганцавіцкім, Ляхавіцкім і Баранавіцкім раёнах Брэсцкай вобласці, а таксама ў Ашмянскім, Смаргонскім і Астравецкім раёнах Гродзенскай вобласці.

На сайце Міністэрства лясной гаспадаркі размешчана Інтэрактыўная карта забаронаў і абмежаванняў на наведванне лясоў. Карта абнаўляецца ў рэжыме рэальнага часу, таму даныя могуць мяняцца на працягу дня.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# АБ'ЁМЫ ПАДРЫХТОЎКІ Ў РЭГІЯНАЛЬНЫХ ВНУ БУДУЦЬ РАСЦІ

## Вострая патрэба ў медыках і педагогах

— Калі паглядзець у разрэзе спецыяльнасцяў, то прыём абітурыентаў сёлета будзе павялічаны на медыцынскія (каля 10 працэнтаў) і асобныя педагагічныя спецыяльнасці, перш за ўсё фізіка-матэматычныя. Таксама павелічэнне набору закранула «Дашкольную адукацыю» і «Пачатковую адукацыю». Рост склаў каля 4 працэнтаў. Паколькі сістэмы аховы здароўя і адукацыі адчуваюць пэўны дэфіцыт кадраў, пры планаванні і зацвярджэнні кантрольных лічбаў прыёму мы зыходзілі з іх патрэб, — растлумачыў Аляксандр Бахановіч. — Разам з тым быў скарочаны прыём абітурыентаў на эканамічныя і, скажам так, «неактуальныя» тэхніка-тэхналагічныя спецыяльнасці. Гэта звязана з развіццём нашых прамысловых галін і пераходам эканомікі ўжо на пяты і шосты тэхналагічныя ўклады. Такія падыходы будуць асновай пры фарміраванні плана прыёму ў ВНУ і ў наступныя гады.

Аляксандр Бахановіч заўважыў, што ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы сёлета на 2 працэнты будзе скарочаны прыём у сталічныя ўстановы вышэйшай адукацыі і прыкладна на столькі ж павялічаны прыём у рэгіянальныя ВНУ. Гэта абумоўлена неабходнасцю ўмацавання і замацавання кадраў у абласцях. Першы намеснік міністра адукацыі заклікаў выпускнікоў і будучых абітурыентаў, якія жывуць у рэгіёнах, нацэльвацца на паступленне ў свае ўстановы вышэйшай адукацыі. «Сёння ў рэгіянальных ВНУ і якасць адукацыі, і прафесарска-выкладчыцкі склад, і матэрыяльна-тэхнічная, і вучэбна-лабараторная база не саступаюць нашым мінскім універсітэтам. Таму прынцып «Дзе нарадзіўся, там і прыгадзіўся» мы рэкамендуем браць да ўвагі і развіваць рэгіён, у якім ты нарадзіўся, вырас і з якім плануеш звязаць свой далейшы лёс і работу. Працытую яшчэ раз словы Прэзідэнта: «Моцныя рэгіёны — гэта моцная краіна», — адзначыў Аляксандр Бахановіч. — Міністэрствам адукацыі разам з зацікаўленымі і ў далейшым будуць нарошчвацца аб'ёмы падрыхтоўкі кадраў за кошт бюджэту ў рэгіянальных ВНУ з улікам заяўленай мясцовымі органамі ўлады патрэбы ў падрыхтоўцы тых ці іншых спецыялістаў і рэгіянальных адметнасцяў».

Установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі Беларусі прымуць сёлета 39,6 тысячы абітурыентаў, у тым ліку на бюджэтную форму — 27,4 тысячы, што на 1,1 тысячу больш, чым у 2022 годзе. На платную форму навучання прымуць 12,2 тысячы чалавек, што на 1 тысячу менш, чым летась. На ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі плануецца прыняць каля 26 тысяч чалавек. Гэта лічба засталася на ўзроўні мінулага года. Прыём будуць весці 229 каледжаў, якія будуць прымаць абітурыентаў або на ўзровень прафесійна-тэхнічнай, або на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі, або і на той, і іншы ўзровень.

## Перавагі мэтавай падрыхтоўкі

На сайтах ВНУ да 1 мая павінна з'явіцца інфармацыя аб колькасці месцаў, выдзеленых для паступлення на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, з указаннем канкрэтных спецыяльнасцяў і заказчыкаў, якія падалі заяўкі. Аб гэтым праінфармаваў журналістаў **начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей ПІШЧОЎ:**

— У маі вялікая работа і адказнасць ускладаюцца на заказчыкаў кадраў і абітурыентаў па заключэнні дагавораў аб мэтавай падрыхтоўцы і стварэнні конкурснай сітуацыі на мэтавыя месцы. Конкурс неабходны, каб па дадзенай траекторыі паступілі найлепшыя абітурыенты. Варта адзначыць асаблівасць паступлення на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі — правядзенне аднаго ўнутранага ўступнага іспыту ў веснай або практычнай форме (сертыфікаты ЦЭ і ЦТ не патрабуюцца). Пералік пытанняў па вучэбных дысцыплінах, па якіх будзе праводзіцца ўступны экзамен, ужо размешчаны на сайце Міністэрства адукацыі ў раздзеле «Абітурыенту». Таму ўжо сёння ў абітурыентаў, якія плануюць паступаць па такой траекторыі, ёсць магчымасць падрыхтавацца да будучага выпрабавання. Конкурс будзе фарміравацца, зыходзячы з сумы сярэдняга бала атэстата і ўнутранага веснага экзамену.

Арганізацыя мэтавага набору ў многім з'яўляецца важнай задачай якраз для заказчыкаў кадраў, якія ўжо сёння бачаць будучых спецыялістаў, што праз чатыры—пяць гадоў прыйдуць да іх на прадпрыемствы або ў арганізацыі, каб вырашаць канкрэтныя вытворчыя задачы. Якія перавагі ёсць у мэтавай падрыхтоўкі? Яны агульнавядомыя: па-першае, студэнт, які абраў згаданую траекторыю, ужо ў працэсе навучання індывідуалізуе свой адукацыйны працэс: маецца на ўвазе выкананне курсавых работ, дыпломнага праекта па тэмах, актуальных для будучага наймальніка, праходжанне на яго базе вытворчых практык, гэта значыць усё адбываецца ў цеснай прывязцы да канкрэтнага прадпрыемства, з якім заключаны дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы. А на выхадзе спецыяліст, які паспяхова засвоіў адукацыйную праграму, прыходзіць на прадпрыемства і адразу ж паглыбляецца ў тыя задачы, што неабходна вырашаць, — расказаў Сяргей Пішчоў.

Што датычыцца асаблівасцяў паступлення на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ў гэтым годзе, трэба мець на ўвазе, што тэрміны прыёму дакументаў, уступных іспытаў і залічэння дадзенай катэгорыі абітурыентаў вынесены за рамкі асноўнай прыёмнай кампаніі. «З 1 да 5 чэрвеня будзе весціся прыём дакументаў ад абітурыентаў на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. З 6 да 13 чэрвеня яны здадуць адзін уступны іспыт у веснай або практычнай форме (апошняе датычыцца профілю «фізічная культура і спорт» і творчых спецыяльнасцяў). І па 16 чэрвеня пройдзе залічэнне абітурыентаў», — дадаў начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі.

## Тэрміны рэгістрацыі на ЦТ скараціліся

Выпрабаванні цэнтралізаванага тэсціравання пачынаюцца сёлета 14 чэрвеня з беларускай мовы і завяршаюцца 4 ліпеня (гэта асноўныя тэрміны без рэзервовых дзён). «Тыя, хто зарэгістраваўся на ЦТ, але з уважлівай прычыны не змог прайсці яго ў асноўныя дні, змогуць скарыстацца рэзервовымі днямі. Для гэтага ў кожным абласным цэнтры выдзелены пункты правядзення ЦТ, куды трэба будзе звярнуцца і прад'явіць дакументы, якія пацвярджаюць уважлівыя прычыны пропуску», — паведаміў **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК.**

Ён звярнуў увагу абітурыентаў на тую акалічнасць, што тэрміны рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне сёлета крыху скараціліся. Калі ў ранейшыя гады працэдура праходзіла з 2 мая да 1 чэрвеня, то цяпер яна стартуе 10 мая. «Але часу для рэгістрацыі на ЦТ дастаткова, паколькі тэхналогія рэгістрацыі пастаянна ўдасканальвалася. Застаецца форма папярэдняй дыстанцыйнай рэгістрацыі праз сайт Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Можна звярнуцца ў найбліжэйшы пункт тэсціравання і зарэгістравацца для ўдзелу ў ЦТ у любым пункце па краіне. У гэтым галоўнае адрозненне ад цэнтралізаванага экзамену. З іншага боку, значная частка выпрабаванняў выпускнікамі школ будзе пройдзена яшчэ на этапе здачы ЦЭ. У сувязі з тым можна назваць яшчэ адну адметнасць бягучага года — у нас не будзе здвоеных дзён для здачы цэнтралізаванага тэсціравання па такіх масавых прадметах, як руская мова і матэматыка, калі вялікай колькасці ўдзельнікаў трэба было забяспечыць камфортныя і, галоўнае, бяспечныя ўмовы ў час пандэміі для здачы экзамену», — канстатаваў дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў.




Юрый Міксюк запэўнівае, што і падчас ЦТ, і падчас ЦЭ выпускнікам спатрэбіцца толькі веды з базавага курса школьнай праграмы. «Структура тэстаў сёлета зведала пэўныя змены. Азнаёміцца з імі на працягу навучальнага года маглі ўсе: або пры правядзенні рэпетыцыйнага тэсціравання, або пры правядзенні рэпетыцыі цэнтралізаванага экзамену. Частка А — там, дзе трэба выбіраць гатовыя варыянты адказаў, — скарацілася. Пры гэтым частка В, дзе трэба сфармуляваць і запісаць адказ, наадварот, пашырылася. Але ўвогуле складанасць тэста не павялічылася, а яго працаёмкасць скарацілася практычна для ўсіх прадметаў. Заданні па складанасці вытрыманы такім чынам, каб можна было праверыць толькі школьную праграму, не выходзячы за яе межы. Вынікі рэпетыцыйнага тэсціравання паказалі, што навучэнцы могуць падрыхтавацца да тэстаў самастойна або ў класе з настаўнікам і паказаць дастаткова паспяховыя вынікі», — заспакоіў Юрый Міксюк.

Ён дадаў, што пры паступленні ў ВНУ ў абітурыентаў будуць на руках толькі тры сертыфікаты (раней можна было мець чатыры сертыфікаты ЦТ). Выпускнікі школ бягучага года, якія пройдуць два цэнтралізаваныя экзамены, змогуць удзельнічаць толькі ў адным ЦТ па профільнай дысцыпліне. А выпускнікі мінулых гадоў змогуць удзельнічаць у трох ЦТ: па адной з дзяржаўных моў і дзвюх профільных дысцыплінах.

## Магчымасці электронных кабінетаў

Падаць дакументы адначасова ў дзве ВНУ будзе немагчыма, афіцыйна заявіў начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей Пішчоў, адказваючы на пытанне журналістаў.

Пералік дакументаў, якія абітурыент падае ў прыёмную камісію, вызначаны Правіламі прыёму. І там дакладна прапісана, што ў прыёмную камісію павінны былі пададзены арыгінал дакумента аб адукацыі і арыгіналы сертыфікатаў ЦЭ і ЦТ. Дакументы абітурыенты падаюць асабіста. Прыёмныя камісіі ў апошні дзень прыёму працуюць да 18.00. У рамках вызначанага для падачы дакументаў перыяду можна забіраць і перападаваць дакументы колькі заўгодна раз. Можна забраць іх і аднесці ў іншую ВНУ, дзе ёсць больш шанцаў на паступленне. У многіх ВНУ і на факультэтах ёсць агульны конкурс, які прадугледжвае падачу дакументаў адразу на некалькі спецыяльнасцяў аднаго кірунку.

Таксама ў многіх ВНУ дзейнічаюць асабістыя кабінеты абітурыента. Электронны рэсурс дазваляе прайсці электронную рэгістрацыю: запоўніць анкету і заяву, загрузіць фота, размясціць адсканіраваныя атэстат або дыплом, сертыфікаты цэнтралізаваных экзаменаў і цэнтралізаванага тэсціравання, дакументы, якія пацвярджаюць права на льготы пры паступленні.

Электронны кабінет не замяняе падачу арыгіналаў дакументаў асабіста абітурыентам, але дазваляе абітурыентам звяртацца адразу ў сакратарыят сваіх факультэтаў, абыходзячы грамадскую прыёмную камісію. Таксама асабісты кабінет дазваляе на працягу ўсёй прыёмнай кампаніі ў анлайн-рэжыме на асабістых камп'ютарах, планшэтах, смартфонах адсочваць падрабязную інфармацыю пра конкурсную сітуацыю і бягучы прахадны бал на выбраную спецыяльнасць. Сітуацыю з падачай дакументаў і сваё месца ў абітурыенцкім рэйтынгу трэба маніторыць пастаянна. Пазней у асабістым кабінеце абітурыенты адлюстроўваюцца звесткі пра залічэнне ў студэнты.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Пазыкі Усходняй Еўропы дасягнулі рэкорднага ўзроўню



Сёлета ўрады краін Усходняй Еўропы ўзялі крэдыт на суму амаль $32 млрд, паведаміла амерыканскае інфармагенцтва Bloomberg. Гэта ўтрая больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Удакладняецца, што ўпершыню за дзесяць гадоў Польшча, Румынія і Венгрыя ўваходзяць у топ-5 найбуйнейшых пазыкаатрымальнікаў з краін, якія развіваюцца, на замежных рынках. Іх крэдытаванне склала адпаведна $9 млрд, $6 млрд і $5 млрд. Як адзначыла Bloomberg, падобная сітуацыя стала вынікам каласальных матэрыяльных страт з-за ваенных выдаткаў, а таксама выдаткаў на знаходжанне бежанцаў з Украіны. Адбыліся значныя змены на рынку аблігацый. Пазыкі сталі больш дарагімі нават для ўрадаў з дастаткова высокім рэйтынгам. Мяркуецца, што сёлета дэфіцыт бюджэту Усходняй Еўропы ўзрасце да 4,3 працэнта ад ВУП рэгіёна.

## Аўстралія накіруе $2,5 млрд на мадэрнізацыю і пашырэнне ваенных баз на поўначы краіны



Як адзначыў міністр абароны краіны Рычард Марлз, павышэнне баяздольнасці падраздзяленняў, дыслацыраваных на паўночным узбярэжжы краіны, з'яўляецца ключавым напрамкам для ўрада Аўстраліі, паведаміла ТАСС. «З улікам сучасных геастратэгічных умоў аўстралійскае войска павінна атрымаць новыя магчымасці для ажыццяўлення паветраных і марскіх ваенных аперацый з паўночнага ўзбярэжжа краіны, а акрамя таго, у дадзеным рэгіёне павінны быць разгорнуты дадатковыя атрады ВПС, сродкі СПА і далёкай разведкі», — заўважыў Марлз. Заява міністра абароны Аўстраліі прагучала ў рамках рэакцыі ўрада краіны на публікацыю даклада «Нацыянальная абарона» — несакрэтнай часткі вынікова справаздачы па выніках комплекснай ацэнкі абараназдольнасці Аўстраліі, праведзенай экс-кіраўнікамі Мінабароны краіны Ангусам Х'юстанам і Стывенам Смітам. Пасля завяршэння гэтага «самага маштабнага за апошнія 40 гадоў перагляду прырытэтаў у галіне абароны» ўладамі краіны была анансавана новая абаронная стратэгія, якая пасля прыняцця ў 2024 годзе дазволіць уладам рэфармаваць войска.

## У прыгранічных раёнах Перу аб'явілі надзвычайны рэжым

Прэзідэнт Перу Дзіна Балуартэ аб'явіла надзвычайнае становішча ў прыгранічных раёнах краіны ў сувязі з міграцыйным крызісам і ростам злачыннасці. «Такая мера дазволіць праводзіць паліцэйскія аперацыі па кантролі за граніцай з мэтай забеспячэння парадку ў краіне», — сказала Балуартэ на прэс-канферэнцыі, якая транслiравалася на старонцы ўрада ў Facebook. Садзейнічанне паліцыі будуць аказваць узброеныя сілы. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, прынятыя меры звязаныя з тым, што на фоне павелічэння патоку нелегальных мігрантаў з Венесуэлы, Калумбіі і Гаіці ў краіне назіраецца рост злачыннасці. У апошнія тыдні рэзка абвастрылася сітуацыя на перуанска-чылійскай граніцы. Улады суседняй краіны раней таксама зрабілі больш жорсткім пагранічны кантроль, каб не дапусціць уезду нелегальных мігрантаў з Венесуэлы і Гаіці. Цяпер у прыгранічнай зоне сабраліся сотні выхадцаў з названых краін.

Любімае кіно

# Прыгоды вялікага камбінатара

**Фільм «Залатое цяля» святкуе сёлета 55-годдзе з дня выхаду на экраны. Сатырычная камедыя, створаная рэжысёрам Міхаілам Швейцэрам, убачыла свет у 1968 годзе. Аднак і дагэтуль бліскучая экранізацыя аднайменнага рамана Ільі Ільфа і Яўгенія Пятрова застаецца любімай класікай. І таму добрая навіна для яе прыхільнікаў — не прапусціце паказ кінастужкі ў нядзелю на тэлеканале «Беларусь 3».**

Напярэдадні кінасеанса згадаем некаторыя моманты з працэсу стварэння легендарнай кінастужкі. У прыватнасці, на ролю Астапа Бэндара, які, паводле сюжэта, марыць здзейсніць падарожжа ў экзатычную краіну, што абуджае яго да рэалізацыі плана, як раздабыць сабе фінансаванне, да Сяргея Юрскага прабаваліся таксама Мікалай Губенка, Уладзімір Басаў, Аляксандр Парахаўшчыкоў. Альбо цікавы факт, што ў фільме здымаўся акцёр Анатоль Папанаў, але калі скарачалі выніковую версію, сцэны з ім засталіся па-за кадрам... Знакаміты аўтамабіль «Антылопа Гну» па просьбе кінематаграфістаў спраектаваў інжынер Леў Шугураў: у ім выкарысталі



рухавік, трансмісію і раму ад аўто УАЗ-452, задні мост ад ГАЗ-А... А вось што датычыцца музычнага афармлення кінафільма, першапачаткова для напісання музыкі рэжысёр запрасіў Георгія Свірыдава, які нават стварыў тры фрагменты, аднак пасля работа спынілася і супрацоўніцтва двух творцаў перапынілася. Пазней Швейцэр звярнуўся ўжо да Георгія Фірціча. Аднак некаторыя мастацтвазнаўцы лічаць, што ў кінастужцы гучаць творы абодвух кампазітараў.

Раім пераглядзець любімую камедыю і — хто ведае, раптам вас чакаюць яшчэ і ўласныя адкрыцці адносна таго, чаго не заўважалі раней. Паказ запланаваны ў нядзелю, 30 красавіка, на тэлеканале «Беларусь 3».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 190

З 6 да 16 красавіка адбыліся чэмпіянаты Беларусі па шашках-100 сярод мужчын і жанчын. У кожным турніры ўзялі ўдзел па 11 шашыстаў па кругавой сістэме. У мужчынскім турніры свой высокі клас пацвердзіў міжнародны гросмайстар Яўген Ватуцін. Ён захапіў лідарства з першага тура і заваяваў восьмы залаты медаль у сваёй кар'еры. На другім месцы — 17-гадовы майстар Яўген Жукоўскі. Бронзавы медаль і выкананне нормы майстра — вынік 16-гадовага жодзінскага кандыдата ў майстры Мікіты Васько. У жаночым чэмпіянаце другі год запар перамагла майстар спорту Вікторыя Ніколаева. Другой фінішавала майстар Паліна Петрусёва. Бронзавы медаль на фінішы вырвала міжнародны майстар Вера Хвашчынская (Бабруйск), якая атрымала важную перамогу ў апошнім туры. Паглядзіце цікавыя прыклады гульні.

**№ 61** Н. Куртава — А. Немец

**Белыя простыя:** 48, 49, 41, 42, 43, 44, 45, 37, 38, 40, 31, 32, 33, 34, 35, 29 (16)

**Чорныя простыя:** 26, 21, 25, 16, 18, 19, 20, 12, 15, 6, 7, 8, 9, 2, 3, 4 (16)

Чорныя выкарыстоўвалі «рэшата» ў пазіцыі белых і нанеслі ўдар на большасць. Пакажыце камбінацыю.

**№ 62** Я. Ватуцін — М. Чэрнік

**Белыя простыя:** 44, 45, 36, 37, 38, 39, 31, 33, 34, 26, 29, 24 (12)

**Чорныя простыя:** 27, 22, 25, 17, 18, 11, 12, 13, 15, 6, 7, 9 (12)

Белыя рэалізавалі сваю перавагу з дапамогай камбінацыі. Пакажыце ўдар.

**№ 63** М. Акуловіч — А. Куніца

**Белыя простыя:** 48, 49, 42, 43, 44, 45, 36, 39, 40, 31, 32, 33, 27, 29 (14)

**Чорныя простыя:** 22, 24, 25, 18, 19, 20, 12, 13, 15, 6, 7, 9, 2, 3 (14)

Спачатку ціхі ход з пагрозай, затым камбінацыя «масток».

1...24-30! 2.40-34 20-24 3.29:20 25:14 4.34:25 14-20 5.25:23 18:47 6.27:18 12:23+

**№ 64**



**№ 64** Капылоў Я., Захараў П. (Белград, Расія)

**Белыя простыя:** g1, f2, c3, e3, b4, d4, h6 (7)

**Чорныя простыя:** h4, a5, e5, d6, f6, g7, f8, h8 (8)

У сумеснай кампазіцыі двух аўтараў белыя пачынаюць і робяць нічыю.

**№ 65**

**Белыя простыя:** a1, c1, g1, a3, c3, e3, b4, e7 (8)

